# З В А Р О Т

кІраунІцтва Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне", Беларускай Сацыял-дэмакратычнай Грамады, Аб'яднанай дэмакратычнай партыІ БеларусІ, Нацыянальна-дэмакратычнай партыІ БеларусІ, Менскага гарадскога страйкама /стачкома/

І9 жнІуня адбылася спроба антыканстытуцыйнага захопу улады у СавецкІм Саюзе І зьмяшчэньне прэзыдэнта Гарбачова нІбыта па "стане здароуя". Пераварот учынІла савецкая камунІстычная І ваенна-прамысловая намэнклятура. Створана хунта пад назвай "дзяржауны камІтэт па надзвычайным griцы" , куды увайшлІ Янаеу, Язау, Кручкоу, Пуга, Паулау, Бакланау, Старадубцау, ЦІзякоу -- найбольш кансэрватыуныя прадстаунІкІ кІраунІцтва КПСС.

Пераварот хочуць зрабІць людзІ учарашняга дня, дзеячы без пэрспэктывы. Антыканстытуцыйны захоп улады у СавецкІм Саюзе кансэрватыунымІ сІламІ стварае пагрозу дэмакратыІ, свабодзе І сувэрэнІтэту рэспублІк. ТакІ паварот падзеяу -- тыповы для канаючых рэжымау І памІраючых Імпэрыяу. Гэта апошняя фаза Іхняга Існаваньня, аднак самая небясьпечная. Таму патрэбная вытрымка, упэуненасьць у будучынІ І разважлІвасьць, каб годна прайсьцІ праз небясьпечны апошнІ пэрыяд трываньня ІмпэрыІ.

Ня можа быць нІякай веры нІякІм абяцаньням путчыстау. Будучы І раней пры уладзе, яны давялІ народ да беднасьцІ, а эканомІку -- да краху.

Мы, людзІ БеларусІ, павІнны памятаць, што Імпэрыя КПСС ня мае нІякІх правоу на нашае жыцьцё, нашую гаспадарку, нашую тэрыторыю І наш народ. Нельга прызнаваць І выконваць распараджэньнІ бальшавІцкІх змоушчыкау, якІя абапІраюцца на бяспрауе І грубую ваенную сІлу.

Дзейнасьць самазванага "прэзыдэнта" І яго супольнІкау не павІнна распаусюджвацца на тэрыторыю сувэрэннай БеларусІ. КалІ Прэзыдыюм Вярхоунага Савету БССР ня прыме адпаведнай заявы, ня склІча нечарговае сэсІІ ВС БСС -- ягоныя удзельнІкІ назаусёды пакрыюць сябе ганьбаю здраднІкау І паслугачоу хунты.

Кожны чалавек або дзяржауны орган, якІ падтрымлІвае незаконны,

злачынны "камІтэт" І выконвае яго распараджэньнІ, нясе крымІнальную адказнасьць. Разам з тым усе дзеяньнІ народу у абарону сваІх правоу, законау І КанстытуцыІ Беларускай РэспублІкІ, накІраваныя супраць путчыстау, зьяуляюцца законнымІ.

- ЛюдзІ у розных рэспублІках падымаюцца на барацьбу са злачыннаю хунтаю. Мы заклІкаем да дзейснае салІдарнасьцІ усІх, каму дарагая свабода й дабро народау, І падтрымлІваем заклІк Барыса Ельцына распачаць бестэрмІновы страйк на рабочых месцах.

Усе дэмакратычныя сІлы БеларусІ, усе людзІ добрай волІ павІнны зараз аб'яднацца на адной плятформе - плятформе абароны дэмакратыІ І незалежнасьцІ БеларусІ.

Жыве Беларусь!

I9 жнІуня I99I г.

20 жнІуня на плошчы ля Дома Урада -- сустрэча з народнымІ дэпутатамІ БССР ад АпазІцыІ. Пачатак а I8.00 гадзІне.